жыць апошні. Але гэта мы значна пашырыліся ў сваіх разважаннях, пачалі аналізаваць праблему ў глабальным плане, дзе зло ад звычайных слоўных перапалак, абвінавачванняў, заяў і пратэстаў перарасло ў дзеянне “злой сілы” – ваенныя канфлікты, рэвалюцыі, войны. Будзем вяртацца да праблемы лакальнага зла, якое таксама добра давалася ў знакі (ды і да сённяшняга дня даецца) людзям. Як бы чалавек не хацеў, але без зла, на вялікі жаль, амаль не абыходзіцца ягонае жыццё. Проста, зло суправаджае любога з нас, “вылазіць на паверхню” у самы непадыходзячы момант і час. І ў гэтым таксама ўзмацняльнасць зла, яго падвоенасць, патроенасць, страшэнная сіла адмоўна-негатыўнага, як у народзе даволі часта называюць “забіваючага” уздзеяння.

Такім чынам, зло (катэгорыю зла) можна трактаваць зыходзячы з філасофскіх канонаў, і як дзейсную, даволі ваяўнічую сілу і тады адмаўленне ад яго будзе выступаць перад намі не нейкім “заканамерна-натуральным”, а своеасаблівай маральна-духоўнай каштоўнасцю. Дарэчы, характэрнай усім далёка не ў раўназначнай прапорцыі. І тут ужо зло ёсць неабходнасць тлумачыць, як нешта самастойнае, самазацвярджальнае, пастаянна прысутнічае ў душах людзей, але “да часу” не абуджанае, не запатрабаванае. Канешне, нараджэнне зла, яго першакрыніцу, узмацняльнік злых намераў, можна знайсці ў эгаізме чалавека (лакальнае), чалавецтва, людзей (глабальнае). Лёгка такую пазіцыю растлумачыць – для “самаадмаўлення” эгаізму зла патрабуецца (першапачатковая ўмова!) яго папярэдняе самасцвярджэнне, каб адмовіцца ад сваёй выключнай волі, па логіцы рэчаў, неабходна спачатку мець яе. Мала гэтага, прыватныя пачаткі і сілы спачатку павінны адасобіцца, “адыйсці” ад агульных, а таму разглядаемых як агульначалавечныя, гуманныя, прынцыпаў і канонаў, і імкнуцца да выключнага валадарства. Відаць, такое разважанне цалкам лагічнае, бо навошта тады было ўзнікаць сусветнай субстанцыі зла, напрыклад, калі адкінуць ідэю переваг, лідэрства і ўсё таго ж валадарства? Але ж тут неабходна разглядаць яшчэ і іншы аспект – гэтае памкненне магло быць важным і абавязковым, у першую чаргу, для таго, каб зло (прапаведнікі, носьбіты зла) на вопыце змаглі пераканацца ў карэннай нядзольнасці свайго самасцвярджэння і (як заканамерны вынік!) злучыцца з агульным пачаткам безумоўнага дабра, усёахапляючага і ўсёпануючага.

***Л.Н. Нямкова***
*Філіял БДЭУ (Бабруйск)*

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ – ВАЖНЫ ФАКТАР ДАСЛЕДАВАННЯ САЦЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Гістарычная аснова фальклора ў тым, што ў ім адлюстроўваюцца гістарычныя падзеі і канкрэтныя асобы, а задача даследчыка ў тым, каб дайсці да рэальнасці, размясціць усе у лагічнай паслядоўнасці.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

Актыўныя дзеянні ўкраінскіх казакаў на тэрыторыі Беларусі у другой палове XVI-XVII стст. з'яўляюцца адной са значных прычын узнікнення і шырокага распаўсюджвання казацкіх песен. Многія з іх заносіліся на Беларусь самімі казацкімі атрадамі (загонамі). Ва ўмовах новай тэрыторыі нават распаўсюджаныя на Украіне паэтычныя сюжэты атрымліваюць адпаведна, беларускі напеў і становяцца фактам нацыянальнай народнай песнятворчасці.

Асабліва шмат беларусаў пайшло ў казацкія атрады ў час паўстання на чале з Севярынам Налівайкам (1595 г.), якое пачалося на Украіне, а потым распаўсюдзілася і на значную частку Беларусі. Аб'яднаўшыся, паўстанцы ўзялі многія беларускія гарады, у тым ліку Слуцк і Магілеў.

Пра гэтя падзеі расказваецца ў песні "Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула", дзе паказана сцэна штурму Магілева і вялікія страты польскага войска. Не здзіўляе, што ў гэты перыяд гісторыі ў песнях з'яўляюцца новыя словы: гарматы, самапалы і іншыя, незвычайныя для народных песен выразы: войска запарожцаў "з гармат да рэвнуло", казакі "повеялі з самопалоў густо". Гэтая лексіка адлюстравала тыя новаўвядзенні, якія з'явіліся ў рэчаіснасці, у дадзеным выпадку выкарыстанне агнястрэльнай зброі (раней у песнях гаварылася аб мячах, стрэлах). У радзе казацкіх песен вызначаецца месца бітвы і смерці казака. Часам гэта проста шырокаўжывальны мастацкі прыем, і ўсе не адпавядае рэчаіснасці (напрыклад, у песні "Ой, у Таганрозе, ой, ў Таганрозе случылася бяда" і інш.), а адлюстроўвае прасторавую аддаленасць дзеянняў. Але ў некаторых выпадках мастацкая ўмоўнасць абапіраецца на факты рэчаіснасць – напрыклад, смерць маладога казака ў Слуцку (песня "Эй, у Слуцку-горадзе, эй, у Слуцку-горадзе") магла быць сапраўднай і магчыма адносілася ці да 1595 г., калі казацкі атрад С. Налівайкі захапіў Слуцк, ці калі казацка-сялянскі загон пад кіраўніцтвам Яна Сакалоўскага, паплечніка Б. Хмяльніцкага, пачаў штурм Слуцкай крэпасці.

У маі 1648 г. на Украіне пачалося паўстанне на чале з гетманам Б. Хмяльніцкім, якое перарасло ў вялікую вызваленчую вайну супраць сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнету. У песні "Із-за Слуцка, із-за Клецка" адлюстраваны водгук на паўстанне пінскіх гараджан супраць польскіх феадалаў, "когда поляки вырезали и потопили в р. Пине 14000 пинских жителей, которых казацкий полковник Небаба не успел спасти". У песні адлюстраваны рэальныя гістарычныя падзеі XVII ст., яе тэкст прыводзіць В. Ластоўскі ў сваей "Кароткай гісторыі Беларусі". Былі вельмі папулярныя героі казацка – сялянскай вайны 1648-1651 гадоў, абаронцы "чорнага люду". У вуснай народнай творчасці ў радзе варыянтаў вядома песня аб Маразенку, у якой гаворыцца аб трагічнай смерці бясстрашнага героя – палкавога есаула Крапівянскага палка Нестара Маразенкі, аднаго з паплечнікаў Б. Хмяльніцкага, які змагаўся супраць польскіх паноў і прымаў удзел у асадзе г. Збаража ў 1649 г.

Пылкае жаданне, каб хутчэй прыйшлі рускія, "нашы сродныя", выказваецца ў песне "Ой, калі б, калі...", якая дае падставу меркаваць, што песня гэтая ўзнікла ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667). Ідэя

ўз'яднання з Расіяй выразна выступае таксама ў беларускай казацкай песні "Туман, туман па даліне". Усе спробы "турчына", а затым польскага пана падкупіць казака "срэбрам-злотам" і мэдам-півам" і перацягнуць яго на свой бок не ўвянчалася поспехам. Казак застаецца непахісным у сваей рашучасці: " Мы з русінам будзем жыці".Казацкія гістарычныя песні аб'ядноўваюць розныя па паэтыцы і па часе ўзнікнення творы, у якіх адлюстроўваюцца гістарычныя падзеі і перадаюцца адносіны народа да той рэчаіснасці.

***Т.Г. Олексенко***
*Филиал БГЭУ (Бобруйск)*

## СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ КОМПОНЕНТ СОДЕРЖАНИЯ ОБУЧЕНИЯ КАК СРЕДСТВО ПОВЫШЕНИЯ МОТИВАЦИИ ИЗУЧЕНИЯ ИНОСТРАННЫХ ЯЗЫКОВ В ВУЗЕ

В настоящее время, когда иностранные языки рассматриваются как социально-культурный феномен, их изучение направлено на социализацию человека в глобализирующемся мире. При обучении иностранным языкам (ИЯ) важно не только достижение качественных результатов в овладении иноязычным общением, но и поиск реального выхода на иную культуру и его носителей.

Формирование коммуникативной компетенции неразрывно связано с социокультурными и страноведческими знаниями, иными словами, как бы с «вторичной социализацией». Поскольку основным объектом является не страна, а фоновое знание носителей языка, то правомерным было бы ввести социокультурный компонент обучения ИЯ, на базе которого студенты формировали бы знания о реалиях и традициях страны, включались бы в диалог культур, знакомились с достижением национальной культуры в развитии общечеловеческой культуры.

Социокультурный компонент действительно служит стимулом повышения мотивации изучения иностранного языка и средством обучения иноязычной культуре. Для оптимальной организации учебного процесса важно в первую очередь глубокое знание мотивов учения студентов, и, во-вторых, правильно выявлять их и разумно управлять ими.

Таким образом, в системе обучения ИЯ как иноязычной культуре, в первую очередь, важны средства поддержания мотивации к познавательной, развивающей и воспитательной деятельности, что в конечном итоге вызывает у студентов коммуникативную мотивацию и повышает эффективность процесса обучения.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by